ПАЛАЖЭННЕ
аб VI абласным
конкурсе юных
выканаўцаў
«Чароўныя смычкі»

1. Арганізатарамі VI абласнога конкурсу юных выканаўцаў «Чароўныя смычкі» (далей – конкурс) з’яўляюцца Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт і ўстанова адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Рыгора Шырмы”.

2. Асноўнымі мэтамі конкурсу з’яўляюцца:

падтрымка таленавітых маладых выканаўцаў (навучэнцаў устаноў адукацыі), развіццё іх творчых здольнасцей і павышэнне прафесійнага ўзроўню;

папулярызацыя інструментальнай музыкі ў Рэспубліцы Беларусь і Брэсцкай вобласці ў прыватнасці;

захаванне традыцый і пошук новых шляхоў развіцця нацыянальнай струнна-смычковай школы.

3. У конкурсе могуць браць удзел навучэнцы ДМШМ, ДМШ і ўстаноў адукацыі сістэмы Міністэрства адукацыі (далей – канкурсанты).

4. Для непасрэднага кіраўніцтва правядзеннем конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт).

5. Аргкамітэт:

ажыццяўляе кіраванне падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу;

разглядае і зацвярджае склад журы конкурсу;

узаемадзейнічае з зацікаўленымі суб’ектамі культурнай дзейнасці і іншымі арганізацыямі па пытаннях падрыхтоўкі, правядзення і асвятлення конкурсу ў сродках масавай інфармацыі;

зацвярджае сумы ўзнагароджанняў членаў журы;

вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення конкурсу.

6. Пасяджэнні аргкамітэта лічацца правамоцнымі, калі ў іх бярэ ўдзел не менш за дзве трэція яго складу. Рашэнні аргкамітэта прымаюцца адкрытым галасаваннем і лічацца прынятымі, калі за іх прагаласавала больш паловы членаў аргкамітэта з прысутных на пасяджэнні.

Рашэнне аргкамітэта афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня аргкамітэта.

7. Умовы правядзення конкурсу.

7.1. Конкурс праводзіцца ў намінацыях “Скрыпка” і “Віяланчэль” па ўзроставых групах:

“Скрыпка”

A - выканаўцы ва ўзросце да 8 гадоў уключна;

B - выканаўцы ва ўзросце ад 9 да 10 гадоў уключна;

C - выканаўцы ва ўзросце ад 11 да 13 гадоў уключна;

D - выканаўцы ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў уключна.

“Віяланчэль”

A - выканаўцы ва ўзросце да 8 гадоў уключна;

B - выканаўцы ва ўзросце ад 9 да 10 гадоў уключна;

C - выканаўцы ва ўзросце ад 11 да 13 гадоў уключна;

D - выканаўцы ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў уключна.

Узрост удзельнікаў вызначаецца на дату правядзення конкурсу.

7.2. Праграмныя патрабаванні:

Конкурсныя праслухоўванні праводзяцца публічна. Усе творы выконваюцца на памяць.

Праграма конкурснага выступлення ўключае твор буйной формы і п’есу рухомага характару ва ўсіх узроставых групах. Ва ўзроставай групе А дапускаецца выкананне дзвюх рознахарактарных п’ес. Пажадана выкананне твору беларускага кампазітара.

Працягласць выступу у ўзроставых групах А і В не больш за 10 хвілін, у групах С і D не больш 15 хвілін.

Праграма ўдзельніка павінна адпавядаць патрабаванням конкурсу. Змены ў заяўленай праграме не дапускаюцца.

7.3. Для ўдзелу ў конкурсе асобна канкурсант альбо ўстанова адукацыі, у якой ён навучаецца, накіроўвае наступныя матэрыялы:

запоўненую электронную форму заяўкі;

копію дакумента, які сведчыць асобу (пашпарт або пасведчанне аб нараджэнні);

пагадненне на апрацоўку асабістых дадзеных *(дадатак 1).*

7.4. Заяўкі на ўдзел у конкурсе прымаюцца да 10 красавіка 2023 года (уключна). Форма заяўкі прыкладаецца. Усе матэрыялы прадстаўляюцца ў электронным выглядзе як дадатак да формы заяўкі. Пытанні наконт заяўкі і ўдзелу ў конкурсе па кантактных тэлефонах: +375295231707.

7.5. Абавязковай умовай удзелу ў конкурсе з'яўляецца набыццё удзельнікам конкурсу білета на заключны канцэрт. Кошт - 20 рублёў.

7.6. Праслухоўванні ўдзельнікаў конкурсу праводзяцца ў адзін тур у Брэсцкім музычным каледжы 29 красавіка 2023 года.

8. Для прафесійнай ацэнкі конкурсанта аргкамітэт зацвярджае склад членаў журы конкурсу (далей– журы) у колькасці не больш за пяць чалавек у кожнай катэгорыі.

Журы складаецца з вядомых беларускіх музыкантаў (педагагічных работнікаў навучальных устаноў у сферы музычнага мастацтва і творчых дзеячаў).

9. Журы:

ацэньвае прафесійны і творчы ўзровень выканання канкурсантаў;

афармляе пратаколы вынікаў галасавання;

выбірае прызёраў і дыпламантаў конкурсу у кожнай з катэгорый і ўзроставых груп конкурсу і прадстаўляе іх спіс у аргкамітэт для ўзнагароджання;

інфармуе канкурсантаў аб выніках іх удзелу ў конкурсе.

10. Журы ацэньвае канкурсантаў па
10-бальнай сістэме па наступных крытэрыях:

узровень тэхнічнага майстэрства;

адметнасць творчай індывідуальнасці выканаўцы;

трапнасць передачы стылістычных асаблівасцяў твораў;

11. Размеркаванне прызавых месцаў і спецыяльных прызоў адбываецца шляхам галасавання ўсіх членаў журы.

У выпадку, калі ў конкурсе прымае ўдзел вучань альбо сваяк члена журы, дадзены член журы абавязаны адмовіцца ад судзейства ў той узроставай групе, дзе бярэ ўдзел яго вучань (сваяк).

12. Рашэнні журы прымаюцца на пасяджэннях і афармляюцца пратаколамі, якія падпісваюць члены журы. Журы правамоцна прымаць рашэнне, калі на пасяджэнні прысутнічае не менш за дзве трэці ад яго поўнага складу. Рашэнне лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала больш паловы прысутных на пасяджэнні членаў журы. У выпадку роўнасці галасоў меркаванне старшыні журы з’яўляецца вырашальным. Рашэнні журы па кожнай з катэгорый і ўзроставых груп конкурсу абвяшчаюцца неўзабаве пасля заканчэння праслухоўвання ў дадзенай групе. Усе рашэнні журы канчатковыя і не могуць быць аспрэчаны.

13. Пераможцы конкурсу ва ўсіх узроставых групах кожнай катэгорыі атрымліваюць дыпломы I, II і III ступені з прысваеннем звання Лаўрэата конкурсу.

Журы мае права прызначыць Гран-пры аднаму з уладальнікаў першай прэміі ў любой узроставай групе, паказаўшаму выбітныя прафесійныя і творчыя здольнасці.

14. Канкурсанты, якія паказалі добрыя, але недастатковыя для дасягнення прызавых месцаў вынікі, атрымліваюць ганаровыя граматы.

15. Педагогі і канцэртмайстры лаўрэатаў атрымліваюць ганаровыя граматы конкурсу.

16. Фінансаванне конкурса ажыццяўляецца згодна з каштарысам расходаў за кошт сродкаў:

упраўлення культуры Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта, у межах сродкаў, прадугледжаных на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў;

збораў з канцэртаў;

спонсарскіх, дабрачынных сродкаў;

іншых паступленняў, не забароненых заканадаўствам.

Бюджэтныя сродкі і прызначаныя пазабюджэтныя крыніцы фінансавання, за выключэннем сродкаў ад уступных узносаў, накіроўваюцца на:

аплату праезда, пражывання, харчавання і работы членаў журы;

выплату ганарараў за канцэртныя выступленні прафесійных артыстаў;

аплату паслуг перакладчыкаў, наладчыкаў музычных інструментаў, відэаапературараў, фатографаў;

аплату транспартных паслуг;

выраб друкаванай прадукцыі (буклетаў, праграм, афіш, флаераў і інш);

аплату расходаў паштовых паслуг;

аплату за афармленне сцэнічных пляцовак і канцэртных залаў;

аплату размяшчэння рэкламы ў друкаваных і электронных сродках масавай інфармацыі;

аплату канцылярскіх і іншых гаспадарчых расходаў;

іншыя выдаткі, не забароненыя заканадаўствам.

Усе фінансавыя разлікі падчас правядзення конкурсу на аснове кантрактаў і дагавораў ажыццяўляе ўпраўленне культуры Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта.

Праезд і харчаванне ўдзельнікаў конкурсу адбываецца за кошт накіроўваючага боку або асабістых сродкаў удзельнікаў.

17. Кантакты конкурсу:

Электронная пошта: mar.aleks.79@gmail.com

Факс: +375162590607

+375295231707

Вэб-сайт: mus.brest.by

Фізічны адрас: установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Рыгора Шырмы", вул. Гогаля, 7, 224030, г. Брэст.